Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску

# НАША НІВА

№ 38 (76)
30 сьнежня
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

**ТЭЛЕПРАГРАМА**

**20 MTV**

**5** Навіны на рынку бэстсэлераў.

**РАДЫЁ**

**6** Свабода, BBC і іншыя.

**ІНСТРУКТАР**

**7** Усё пра татуіроўкі.

**АФІША**

**9** Навіны кіно і відэа.

**РОЗНАЕ**

**12** Пра шкоду агуркоў!

**Інфарматар**




Мікрагісторыя

# СТАРЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ІМЁНЫ

*(паводле актавых кнігаў канца XVI — пачатку XVII ст.)*

Імёны тагачасных людзей — своеасаблівая палітра сярэднявечча. Як пэўны ляндшафт вымагае дойліда дапасоўваць свае творы да твару прыроды, так і імёны, зьнітаваныя з прозьвішчамі, узьніклі на падрыхтаванай глебе пэўных спалучэньняў гукаў і колераў.

Імя застаецца запісаным ў Актавай кнізе і ёсьць часьцяком адзіным сьведчаньнем пра тое, што чалавек быў, думаў, да нечага імкнуўся. Імя — на дзіва — ніколі не памірае, аднойчы прамоўленае ці запісанае, яно нясе эмацыйную інфармацыю пра мінуўшчыну, насычае тэкст неўміручай прысутнасьцю Духа Жывога...

... Сабасьцян Спадоба, Апанас Перапеча, Стэфан Шчодра, Хама Драхба, Іван Жыжліч, Сак Вароніч, Аўдзей Кашчыч, Пятрук Калавойша, Юшко Літвін, Ян Бяленін, Рыгор Бліскаўка, Сьцяпан Хіха, Улас Дуйніч, Ян Курапат, Грышка Палубесак, Зафея Зелянуха, Янка Ліхі, Грышка Цудны, Каспар Непітушчы, Лаўрын Дзеравянка, Яцына Сьвіціч, Ждан Золата, Макар Летуновіч, Багуфал Тур, Каледа Станелевіч, Ждан Заранка, Даніл Жрол, Ждан Валкатоп, Стас Дудка, Хведар Клюйвада, Радота Мянчук, Яска Скрыпка, Арцюх Краска, Даніла Драб, Нікан Ножыч, Марцін Магілка, Піліп Салітратнік, Ян Янчура, Ян Дуброва, Філя Палімонт, Іван Цыбуліч, Сэбасьцян Нануся, Іванец Трыножыч, Геліяш Жаба, Алена Сьвіцянка, Францішак Весялін Згадада, Яўфімія Вербічанка, Іван Жынь, Лук'ян Тананайка, Матфей Ведзьміч, Шымон Вярэнька, Ціш Даламан, Ян Зімапад...

У імя ёсьць гісторыя паходжаньня. Яно ня ўзьнікла зьніадкуль і рэдка калі губляецца, яно надзяляе чалавека адбіткам сваёй таямнічасьці і ўбірае ў сябе рысы свайго носьбіта. Яно не маўклівае нават тады, калі бачыш яго толькі вачыма на аркушы. І калі з імем зьвязаная пэўная падзея, калі можна даведацца, што яно належала кавалю ці млынару, аптэкару ці зэгармістру, стадольніку ці бакаляўру, тады магчыма аднавіць невялічкія фрагмэнты жыцьця несельнікаў актавых кнігаў памежжа XVI-XVII ст.: мешчаніна Яна Байкоўскага, "скаранага на горла празь меч" на пляцу перад ратушай у Менску; татаркі Жугры Маскоўкі, абвінавачанай суседам у чарадзействе; пісара менскае мытні Васіля Масленка, які не пажадаў вярнуць мытныя статут і пячатку на загад канцлера Льва Сапегі; "шляхціча учцівага" Стэфана Дастаеўскага; земяніна Мікалая Ваўчка, які ўчыніў дэбош у канцыляры менскага замку, бегаючы зь мячом па замкавых валах; высакароднай юнай Сафіі Слуцкай, што паўстала супраць шлюбнай змовы... І тады ізноў...

... Ганна, Багданіца, Еўга, Паўлая, Паланэя, Альжбеціца, Ульяніца, Варуша, Марта, Раіна, Алюха, Барбарыца, Дамінітра, Гасюта, Арына, Агрэня, Васюта, Кандрута, Ядзьвіга, Аршуля, Наталіца, Таміла, Калгота, Адося, Сьветахна, Тоцяна, Някраса, Хрысьцініца, Кася, Ждана, Куліна, Нявера, Дося, Луцыя, Пэрсіда, Альжута, Багдзюша, Зузанка, Нядзелка...

... Адам, Амбражэй, Якуб, Марцін, Хвалей, Урбан, Лаўрын, Міхалюта, Хама, Альбін, Фалей, Тамаш, Грын, Улас, Андрэйка, Фларыян, Стас, Філон, Енах, Яраш, Ясь, Ярута, Хілімон, Херубін, Ждан, Міхал, Геранім, Даніла, Малей, Лявон, Раман, Касьцюк, Хведар, Ленарт, Харук, Фурсіян, Богуш, Міхно, Мелех, Шчасны, Севярын... — месьцічы, землякі, суродзічы.

Чалавек суіснаваў у прасторы разам зь безьліччу нежывых рэчаў, саграваў іх сваёй прысутнасьцю, надаваў усяму знаёмаму-незнаёмаму ня назвы, а менавіта імёны. Чалавек выяўляў у гэтым сваё асабістае стаўленьне да навакольнага сьвету, пашыраючы навонкі свой уласны міт. Ён нібы ўтвараў праз гэта своеасаблівы зачур, — каб схавацца ад неабдымнасьці, невядомасьці, а часам і варожасьці навакольнага сьвету. Для большасьці сярэднявечных людзей жыцьцё абмяжоўвалася скраем леса, цёмныя нэтры якога ажыўляліся і саграваліся, рабіліся фактам чалавечай гісторыі праз імёны, якія надаваліся ўсялякаму прыроднаму знаку, кавалку зямлі, што быў адрозны ад іншых. Калі гэта было балота, дык — Шырокае, Мшонае, Зачалае, Савінае, Кажанскае, Кісьлінае... Калі лог, дык — Бабровы, Вялікі, Глыбокі, Каменны, Срэбны. Калі лес — Салаўіны, Чорны. Гай, пушча — Грыбаўшчына, Бацяжынскі, Кругляк, Лугагай Верадоўскі, Хомек Востраў (што пад Маладэчнам), Голасавы, Барок. Калі ж урочышча — Бабіна вада Букрыйная гара, Баран, Воранава, Елавец Гарохавішча, Жабавода, Кажушок, Калюгі, Карчаваціцы, Лызанос, Пад высокай гарою, Пад дубам Чарнасьнетам, Пад пнём дубовым, Панядзелкаўшчына, Сутаны, Турава, Чармены ручай, Чарневы Брод, Чорнае калена, Сіняя лужа, Грэйботкі, Папова горка, Ізьбішча, Верх залаты, Дрыгінь, Ганезы, Старына вялікая, Крыніца, Крыўцы, Глыбокая даліна, Верх·ялінкі, У бярозавага мастка, Сосны радовыя. У Менску — урочышча Дзьмітроўская гара, Ляхавая лука. Імёны даваліся ніўкам, грунтам, шнурам — ад імёнаў іх гаспадароў і іхніх продкаў: Ахрэмаўшчына, Шушчэўская, Яноўская, Калесьнікава... Нават вязьніца ў Менску мела сваё імя — Дубоўка, ці, магчыма, Дыбоўка — ад "дыбы". Тое самае і менскія дамы — Гурыноўскі, Ясеньскі, Вільчаковы. А таксама масты — Нізкі, Вялікі.

Я бачу гэтыя імёны, запісаныя ў старыя архіўныя кнігі, я чую іх, нібы старадаўнюю музыку...

**Вольга Бабкова**

Вязьні

## Калядны падарунак для ўкраінцаў

Пяцёра ўкраінцаў, арыштаваных у Менску ў красавіку за ўдзел у Чарнобыльскім Шляху, на Каляды вызваленыя з турмы і зьехалі ў Кіеў. Яшчэ двое — Андрэй Шаптыцкі і Сяргей Патапаў засталіся ў СІЗО. Ім на год скарацілі тэрмін...

*Падрабязна пра гэта — на старонцы 3.*

Адамовіч

## Прысуд адкладаецца...

Як і прадбачылася, працэс над Адамовічам, Хамайдам і Плешчанкам, які адбываецца ў Віцебску, пачаўся з праблемаў і праходзіць з працэсуальнымі парушэньнямі. Першыя паседжаньні занялі тыдзень. Працэс адкладзены да 11 сьнежня.

*Падрабязнасьці — у матэрыяле на старонцы 3.*

Літаратура

## Сяброўка Прэзыдэнта

Выпадкова кантралёрка заўважыла, што ўсё зьмянілася ў ейным жыцьці. Гэта было непрыемнае адчуваньне, бо сапраўднае жыцьцё пачалося ня так даўна, каля дзесяці гадоў таму, калі ў горадзе праклалі першую лінію мэтро. Тады кабета зразумела, што мусіць прысьвяціць усю сябе для служэньня людзям, і зрабілася кантралёркай...

*Працяг каляднага апавяданьня — на старонцы 14.*

Кніга і кампутар

## Біркерц у Інтэрнэце

Сёньня мы прапануем вам запіс он-лайнавай (у найпростым інтэрнэтаўскім этэры) канфэрэнцыі пад назвай "Ці праўда, што кібэрпрастора разбурае грамадзтва?" з удзелам Свэна Біркерца, прадстаўніка рэдакцыі інтэрнэтаўскага часопіса The Atlantic Monthly Online Скота Стосэля (вядучага дыскусіі) і тых, хто, седзячы перад маніторамі сваіх кампутараў, праз Інтэрнэт маглі задаваць свае пытаньні.

*Чытайце на старонцы 14.*

Наша Ніва 30 сьнежня 1996 № 38 (76)

# Юда Макавэй Рэчы Паспалітай

*... Прадмесьце Прагі, заслоненае габрайскім рэгімэнтам*, здабыта штурмам; усё загінула пад ударамі мяча. Назаўтра цэлы полк быў знойдзены на фартыфікацыях у вечным сьне; ні адзіны жаўнер ня зьбег перад пераклічкаю сьмерці. Тыя людзі заслугоўвалі быць французамі!...*

(Дэпутат французскага міністэрства юстыцыі Сальвэртэ — у адказ на антысэміцкія выпады дэ Манціны ў 1830 г.)

Расейскаму панаваньню прыйшоў канец. Генэрал Мадалінскі, шэф брыгады Нацыянальнай кавалерыі, ударыў першым на чале 10 швадронаў**. Выкліканая гэтым сьмелым учынкам бура дакацілася да старажытнай сталіцы Кароны — Кракава. Вільня яшчэ рыхтуецца, а Малая Польшча ўжо лікуе. Гарадзенскі шляхціц Андрэй Тадэвуш Банавэнтура Касьцюшка прыносіць прысягу і выдае Акт, абвяшчаючы паўстаньне па ўсёй Рэчы Паспалітай. У рух прыйшлі ўсе народы на вялікіх абшарах Кароны і Вялікага Княства.

Пад Актам паўстаньня 1794 г. стаяў шэраг подпісаў. Сярод іх — імя аднаго габрая, які лічыў, што яго народ ня мае права быць пасіўным назіральнікам, калі Бацькаўшчына гіне. Гэта быў былы камісіянэр*** віленскага біскупа Масальскага, гандляр канямі і пастаўшчык фуражу, жыхар варшаўскага прадмесьця Прагі Бэрэк Ясялевіч.

Родам Ясялевіч з Жамойці, тут ён убачыў сьвет у 1764 годзе ў Крэтынзе, што ў трох мілях ад Палангі, у сям'і Ёсла. З самага маленства адрозьніваўся вялікай жывасьцю характару. Замест таго, каб спраўна хадзіць у хедэр, не зьвяртаючы ўвагі на парады бацькоў і незадавальненьне настаўнікаў, Бэрэк цэлымі днямі гуляў у ваенныя гульні, майстраваў драўляную зброю, правакаваў вулічныя бойкі, у якіх быў самым актыўным удзельнікам.

Калі надышоў час брацца за розум, хутчэй за ўсё, маладому чалавеку не прыйшлося доўга ламаць галаву над выбарам роду дзейнасьці. Для Бэрэка, як габрая, шлях быў адзіны — гандаль. Прызвычаенаму заўсёды рухацца, яму прыйшоўся да густу такі від дзейнасьці як фактарства****. Хадзіць далёка было ня трэба, бо гаспадар, да якога ён вырашыў наймацца, быў уладаром Крэтынгі, і характар яго цалкам падыходзіў да такога ж пасіянарнага габрая. Служба не абяцала быць сумнай. Каму ж прапанаваў ён свае паслугі? Хто ў Рэчы Паспалітай быў адным з самых вядомых авантурыстаў? Віленскі біскуп Ігнацы Якуб Масальскі.

Постаць патрона Бэрэка настолькі цікавая, што немагчыма не сказаць пра яе хаця б некалькі слоў. Ня гледзячы на забарону касьцёла на азартныя гульні, ён літаральна не адыходзіў ад зялёнага сукна. Быў вядомы ўсёй краіне як дойная карова для вялікіх і малых шулераў. Паразы біскупа налічвалі дзесяткі тысячаў дукатаў золатам. Дзеля дасягненьня ўласных мэтаў ня грэбаваў ніякімі сродкамі, не спыніўся нават перад нацыянальнай здрадаю — каб зьнішчыць сваіх ворагаў Чартарыйскіх, падаўся да расейцаў. Зайздросьцячы бляску буйных магнатаў, стварыў полк уласнага імя з францускіх ахвотнікаў, розных нягоднікаў і іншых падазроных постацяў. У той жа час Масальскі быў чалавекам высокаадукаваным, мецэнатам. Акружаў сябе людзьмі навукі й мастацтва, многім зь якіх дапамог у кар'еры. Шмат зрабіў для распаўсюджаньня асьветы ў Рэчы Паспалітай.

Служба ў біскупа пайшла Бэрэку на карысьць. Разам з Масальскім ён падарожнічае па Эўропе, бывае ў Парыжы, Брусэлі, вывучыў нескалькі моваў. Новы сьвет стварыў з засьцянковага хлопца чалавека сьвецкага. Філязофія францускіх асьветнікаў аказвае ўплыў на Бэрэка, зрэшты, як і на тысячы яго раўналеткаў. Вярнуўшыся ў Рэч Паспалітую, ён, пазнаёміўшыся з поглядамі графа Мірабо, выступае за раўнапраўе габраяў у грамадзтве.

Тым часам, краіна на хвалі эканамічнага ўздыму ідзе шляхам рэформаў. Чатырохгадовы Сойм 1789 году паступова зьнішчае фэадальныя перажыткі. Апроч іншага, даволі востра стаяла пытаньне аб габраях. Пасьля прыняцьця Канстытуцыі 1791 году зьяўляецца шэраг праектаў Калантая, Сташыца, Чацкага і інш. Стаўленьні былі розныя. Напрыклад, вядомы патрыёт Станіслаў Сташыц, ведаючы незадаволенасьць мяшчанаў сваімі гандлёвымі канкурэнтамі, называў габраяў "саранчою края і вечнымі шкоднікамі". І ўсё ж такі, ня гледзячы на процідзеяньні, габраі былі зраўняныя ў правах са шляхтаю. Наогул, адносіны да іх з боку шляхты былі ў асноўным добразычлівыя, чаго нельга сказаць пра іншыя групы грамадзтва.

Каля 1788 году Бэрэк ужо даволі пабачыў у свае 24 гады і асеў у Варшаве на Празе, узяў шлюб, і пачаў гандляваць канямі. Так ён жыў да пачатку паўстаньня 1794 году, калі на карту было пастаўленае існаваньне Рэчы Паспалітай. Пра ўдзел габрайства ў падзеях сьведчаньні даволі супярэчлівыя. На жаль, стаўленьне беларускіх габраяў да "інсурэкцыі", у адрозьненьні ад каронных, было пераважна ня толькі пасіўным, але нават варожым. Бэрэк, прасякнуты ідэямі Захаду, глядзеў на падзеі не як габрай, а ў першую чаргу як грамадзянін Рэчы Паспалітай. Ён бачыў, што атмасфэра паўстаньня мабыць упершыню парушыла муры, якія аддзялялі габраяў ад хрысьціянаў. Разам з рамесьнікамі, шляхтай, законьнікамі, жанчынамі й дзецьмі яны працавалі на будаўніцтве ўмацаваньняў у Варшаве й другіх гарадах у найвялікшай згодзе і з найвялікшай напругай. Тадэвуш Касьцюшка разьлічваў на дапамогу габрайства. Сярод усеагульнага ўздыму й лікаваньня ён прамаўляе палымяную прамову ў казімераўскай сынагозе (пад Кракавам). Але ж Бэрэка не задавальняе, што ўдзел габраяў у паўстаньні абмяжоўваецца галоўным чынам дапаможнымі працамі. Ён хоча прынесьці карысьць Бацькаўшчыне са зброяй ў руках. Служба ў габрайскай міліцыі парадку — гэта для старых. Перад ім стаіць прыклад Аўстрыі, дзе ў часы імпэратараў Ёзафа II і Леапольда I тысячы габраяў бралі ўдзел у турэцкай кампаніі.

У самы цяжкі момант, калі ўжо амаль ніхто ня верыў у перамогу, Бэрэк зьвяртаецца да Касьцюшкі з прапановаю стварэньня палку лёгкай габрайскай кавалерыі, на што 17 верасьня 1794 году атрымаў згоду і званьне палкоўніка. 1 кастрычніка агалошваецца ягоная адозва да суайчыньнікаў. Цікава, што габрай Ясялевіч упершыню назваў Рэч Паспалітую сваёй Бацькаўшчынай.

Наконт існаваньня палка ёсьць розныя думкі. Мне здаецца, што полк усё ж быў створаны, ня гледзячы на тое, што яго назва не сустракаецца ў рэляцыях і ў сьпісе вайсковых частак, якія баранілі Варшаву. Польскі гісторык Корзан у сваёй капітальнай працы "Гісторыя Польшчы пры Станіславе Аўгусьце" выказвае сумнеў у існаваньні палка на падставе недахопу часу на яго арганізацыю. Грошы на патрэбы палка Ясялевіч узяў толькі 6 кастрычніка — 3.000 злотых ужо моцна абясцэненымі скарбовымі білетамі. 10-га таго ж месяца адбылася бітва пад Мацяёвіцамі, у якой Касьцюшка трапляе ў расейскі палон. Да гібелі дзяржавы застаецца прыкладна чатыры тыдні. За гэты тэрмін немагчыма было сабраць полк, ды яшчэ каб яго жаўнеры біліся пасьля страты Начальніка як "ільвы і леапарды" (да чаго заклікалася ў адозьве Ясялевіча).



Другі дасьледчык Эрнэст Лунінскі думае інакш. Яго зусім не зьдзіўляе раптоўнасьць збору палка. Ён спасылаецца на Кілінскага, які ў сваіх "Мэмуарах" піша, што наогул не атрымаў ад Касьцюшкі ні граша на абмундураваньне, толькі званьне палкоўніка. Але, тым ня менш, змог сабраць ужо праз тры (!) дні пасьля адозвы 1780 чалавек. Вайсковым фармаваньням, якія ліхаманкава ствараліся ў тыя дні, былі ўласьцівыя недахопы забесьпячэньня, абмундураваньня, дысцыпліны. Але трэцяе не датычыла палка Ясялевіча. Бэрэк валодаў талентам арганізатара і сілай пераконваньня. Яго падначаленыя былі спаяныя дысцыплінаю ў адно цэлае. Пра тое, што полк існаваў і пра доблесьці ягоных валанцёраў гаворыць Грацкі ў "Трактаце аб Габраях" і Б.Вышынскі ў "Рэформе народу Ізраіля". Аддзел Бэрэка складаўся прыблізна з 500 шабель, гэта 5 харугваў ці 2,5 швадрона. Безумоўна, з такой колькасьцю людзей, плюс яшчэ 5-ы і 7-ы літоўскія рэгімэнты генэрала Якуба Ясінскага — ўсяго каля 4-х тысячаў, сілы Рэчы Паспалітай, якія баранілі прадмесьце Варшавы, былі ня ў стане затрымаць больш чым 35 тысячаў расейскага войска з 86 гарматамі. Яны маглі толькі прыгожа загінуць.

Паводле традыцыі, полк Ясялевіча загінуў амаль цалкам. На жаль, ахвяры, прынесеныя габраямі, не зьмянілі да іх адносінаў мяшчанства. Сярод "пунктаў", якія магістрат і цэхі Варшавы ўручылі расейскаму камэнданту горада генэралу Буксгеўдэну, быў пункт пра выгнаньне габраяў. Буксгеўдэн, чалавек практычны, вырашыў пагрэць рукі. Ён не згадзіўся з магістратам, але загадаў габраям набываць білеты, якія давалі права на знаходжаньне ў горадзе. Вось так заплацілі "ўдзячныя" мяшчане Варшавы габраям за абарону Бацькаўшчыны...

Бэрэк быў адным зь нямногіх, хто ўцалеў у праскай мясарубцы. Пасьля капітуляцыі ён разам з генэралам Заёнчакам (які павінен быў камандаваць абаронай прадмесьця, але ў самым пачатку цяжка паранены выбыў з барацьбы), здаўся аўстрыйцам. Бо, як справядліва лічыў Бэрэк, аўстрыйскі палон усё ж лепей, чым Сібір. Іх кінулі ў крэпасьць Алямюнц, што ў Галіцы. Быў, праўда, яшчэ адзін шлях. Тыя, хто адступіў з генэралам Тамашам Ваўжэцкім у Сандамірскае ваяводзтва, разьлічвалі працягваць ужо безнадзейную барацьбу, але голад, маральная й фізычная зьнямога, брак боепрыпасаў хутка прымусілі герояў скласьці зброю.

Для Бэрэка пачалося новае жыцьцё. З таго моманту, як Касьцюшка даў яму званьне палкоўніка, ён лічыць сябе прафэсійным вайскоўцам. Як і многія былыя ўдзельнікі паўстаньня 1794 году апынуўшыся ў эміграцыі, ён будзе гатовым стаць пад любыя сьцягі, змагацца дзе заўгодна — ад Гішпаніі да Блізкага Ўсходу, з адзінаю толькі надзеяю, што ягоная зброя ўрэшце будзе выкарыстана ў барацьбе за незалежнасьць Рэчы Паспалітай.

15 верасьня 1796 году Бэрэк прапануе аўстрыйцам стварыць 6-8 тысячны габрайскі корпус, але безвынікова. Крайсгаўптман Баўм, які займаўся справамі палонных, лічыў, што большая іх частка, да якой ён адносіў і Ясялевіча, — проста авантурысты. Званьні, якія яны атрымалі ад Начальніка, для аўстрыйцаў нічога ня значылі. Баўм прапанаваў на выбар усім — ці паступаць шарагоўцамі ў аўстрыйскую армію, ці ўвогуле не несьці ніякае службы. Для многіх, у тым ліку і для Бэрэка, гэта былі ганебныя ўмовы. З Аўстрыі трэба бегчы. Яму з Заёнчакам зноў шанцуе. Заёнчака, цяжка параненага, сярод суровай зімы кінутага ў Алямюнцкую крэпасьць, хітрасьцю вызвала жонка, а Бэрэку дапамаглі зьбегчы некалькі прыяцеляў. Сапраўды, у такога чалавека як Бэрэк Ясялевіч не было недахопу ў людзях, у якіх ён выклікаў сымпатыю. Нават аўстрыйскі губэрнатар Львова граф Гайхур адзначаў яго "вялікую дасьціпнасьць, высёласьць і дух таварыства".

Бэрэк і Заёнчак, даведаўшыся, што ў Францыі, дзе канцэнтраваліся эмігранты з Рэчы Паспалітай, ствараюцца легіёны, сьпяшаюцца туды. Біяграфія жыцьця нашага героя з гэтага моманту нагадвае паслужны сьпіс ляндскнэхту часоў Трыццацігадовае вайны. Вочы разьбягаюцца ад назваў мясьцін, дзе яму прыйшлося ўдзельнічаць у бітвах. У Італьянскай кампаніі ён пачынае як просты кавалерыст. Пад час заняцьця Гасконы кавалерыйскі легіён, дзе ён служыў, складаўся з 1.200 шабель. Ад легіёну, які стрымліваў атакі суворўскіх казакаў і аўстрыйскіх драгунаў, засталося толькі 190 кавалерыстаў на змучаных канях. Пераведзены ў 1-ы легіён у званьні ротмістра, ён змагаецца пад Трэбіяй, Нэві 1-ай, Нэві II-ой, Боскаю. У канцы 1800 году легіён Бэрэка, ад якога амаль нічога не засталося, быў перакінуты на Рэйн, дзе генэрал Князевіч ствараў новы корпус. І вось тут, на Рэйне лёс пачынае наносіць Ясялевічу ўдары, балючыя й ганебныя.

Умовы, у якіх Князевіч ствараў свой корпус, былі складаныя. Вакол панавалі інтрыгі і самалюбства былых якабінцаў, радыкалаў і рэвалюцыянэраў. Бэрэк, які ў баі быў першым, зусім згубіўся сярод кар'ерыстаў ды ўсялякіх майстроў атрыманьня ўзнагарод і званьняў. Тое, што Ясялевіч быў габраем і ня быў шляхціцам, мела для тых людзей нашмат большае значэньне, чым колькасьць бітваў, у якіх ён удзельнічаў і праліваў кроў. У выніку атрымалася, што Бэрэк, які меў за плячыма дзьве італьянскія кампаніі, званьне палкоўніка пры Касьцюшку, вымушаны быў у званьні ротмістра падпарадкоўвацца людзям уплывовым, але не зазначаным у ніводнай кампаніі. Ён жаліцца свайму былому камандзіру і Начальніку Касьцюшку, але стары правадыр паўстаньня 1794 году можа падтрымаць свайго былога падначаленага толькі словам. Тое, што дзеелася вакол, таксама давала мала аптымізму.

У мірнай дамове, заключанай у Люнэвіле 9 лютага 1801 году ніводнага слова не было аб Рэчы Паспалітай. Карацей кажучы, падставы для расчараваньня меліся з усіх бакоў. А тут яшчэ ў канцы таго ж году існаваньне самога кавалерыйскага легіёну было пастаўленае пад пытаньне. Пяхотныя часткі, што складаліся з эмігрантаў з Рэчы Паспалітае, былі ўключаныя ў склад рэгулярнай францускай арміі. Кавалерыя легіёнаў ацалела толькі дзякуючы будучаму каралю Нэапаля і шэфу ўсёй францускай кавалерыі Яхіму Мюрату, які аддаў яе на службу ў Цызальпінскую рэспубліку. Але для Ясялевіча ўжо не было розьніцы. Ня бачачы для сябе ніякіх пэрспэктываў, у чэрвені 1802 году ён падае ў адстаўку ў званьні ротмістра І-ай клясы.

Бэрэк мог бы так і атрымліваць сьціплую пэнсію на чужыне ды марнець са сваім сямействам. Дапамагло знаёмства з генэралам Эдуардам Марцье. Марцье, пазьней князь Трэвізо, справядліва лічыў, што та-

Працяг на старонцы 13.

# Юда Макавэй Рэчы Паспалітай

Працяг са старонкі 4.

кіх бязладзьдзяў, што адбываліся з Бэрэкам у яго родным легіёне, не павінна быць у францускай арміі, ды бярэ Ясялевіча пад сваю апеку. Ён дае Бэрэку званьне капітанкватэрмайстра 1-га гановэрскага драгунскага палка, 500 франкаў кампэнсацыі і добрага каня. У той жа час яму прысуджаецца вышэйшая ўзнагарода Францыі — ордэн Ганаровага легіёну.

Пачыналася вялікая эпоха напалеонаўскіх войнаў. Мірныя пэрыяды ў жыцьці Ясялевіча, пасьля таго як ён зьбег з Аўстрыі — толькі кароткія перапынкі між змаганьнямі. У аўстрыйскай кампаніі 1805 году Бэрэк удзельнічае ў бітвах, якія вядомыя нам са школьнай парты — Вэртыген, Аўстэрліц, Ена. Ён ня быў кар'ерыстам. Даведаўшыся аб тым, што генэрал Дамброўскі стварае на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у Пазнаньскім ваяводзтве легіёны, накіраваныя супраць Аўстрыі й Расеі, Бэрэк пакідае свайго дабрадзея Марцье ды сьпяшаецца на Бацькаўшчыну, дзе ён быў прызначаны ў 1 полк конных стралкоў Казіміра Турко. Зноў шэраг бітваў — Тчэў, Гданьск, Мальтэзр-Візэ, Фрыдлянд. За ўдзел у іх 8 сакавіка 1808 году ён быў ўзнагароджаны крыжам "Віртуці Мілітары".

Мабыць, адчуваючы, што французы абышліся зь Ясялевічам нашмат лепш, чым свае, у легіёнах зьмяняюцца адносіны да "бязроднага габрая". Пасьля Тыльзыцкага міру яго робяць шэфам швадрону і ў якасьці кампэнсацыі за непрыемнасьці ў корпусе Князевіча ўзводзяць у званьне падпалкоўніка. Бэрэк даволі эфэктна выглядаў у строі, скроеным паводле вугорскага ўзору. Высокая мядзьвежая шапка была адзнакай, што ён служыць у элітарных частках. Ня выключана, што тады ж Бэрэк прыняў хрост і ператварыўся ў Бэрко, Бэркуя ці Бэрка, а прозьвішча Ясялевіч (ад Ёсла) перарабляецца ў хрысьціянізаванае Язэп.

Пад час міру полк Ясялевіча стаяў у Раве, потым на радзіме героя паўстаньня 1794 году ў Вялікім Княстве Літоўскім Якуба Ясінскага на Куявіі ў Пыздрах. Яго ведаюць ды паважаюць і ў легіёнах, і ў францускай арміі. Здаецца, тут не абышлося бязь нейкага ўласнага магнэтызму, бо Бэрэк Ясялевіч не займаў уплывовага становішча ў эміграцкіх палітычных колах і ў арміі. Ды паводле ўдзелу у бітвах ён ня быў рэкардсмэнам — у імпэратарскай Старой гвардыі многія маглі б даць яму фору. Адзіным месцам, дзе Бэрэк меў вышэйшую ступень, была масонская ложа "Вялікі Ўсход", у якую ён быў прыняты пасьля Тыльзыту. Яго начальнік палкоўнік Турко ў ложы быў толькі "чаляднікам". Мабыць, менавіта сярод масонаў Бэрэк упершыню адчуў сапраўдную роўнасьць, бо там паходжаньне ня мела ніякага значэньня. Тым больш, што Адміністратар "Вялікага Ўсходу", вядомы праціўнік Суворава пад час Італьянскай кампаніі, маршал Андрэ Масэна, герцаг Рывалі, князь д'Эсьлінг сам паводле паходжаньня быў габраем.

Мір працягваўся нядоўга. Раптоўна выбухнула Аўстрыйская кампанія 1809 году, якая стала апошняю ў жыцьці Ясялевіча. Бэрэк загінуў. У мяне не паварочваецца язык казаць "недарэчна". Бо Бэрэк на чале швадрону быў мудрым камандзірам. Але тут бачыцца нейкая жорсткая насьмешка лёсу, бо трэба ж было ўцалець у некалькіх кампаніях, у змаганьнях сусьветнага значэньня, каб загінуць у дробнай сутычцы.

Ужо з самага пачатку ён біўся пад Грыбавам, потым на чале двух швадронаў уланаў ішоў у авангардзе другой часткі арміі генэрала Язэпа Панятоўскага на Асецк і Жэліхаў да аўстрыйскае мяжы. Пад час пераходу ён даведаўся, што ў Коцка над правым берагам Вепра знаходзяцца два швадроны вугорскіх гусараў. Бэрэк разьлічвае раптоўным ударам выбіць іх на другі бераг, што і робіць 5 траўня 1809 году.

... Ён зьявіўся як віхор. Вугорцы панічна пабеглі цераз мост на другі бераг. Але знайшоўся сярод іх адзіны чалавек, які ня страціў галавы. Калі праз мост пранёсься захоплены перасьледам Бэрэк, а зь ім яшчэ некалькі вершнікаў, вугорац апусьціў шлагбаўм. Гэта быў капрал Мешэліц, за свой учынак узнагароджаны срэбным медалём "За храбрасьць". Перашкоды, якую стварыў Мешэліц, было дастаткова, каб гусары апамяталіся і контратакавалі. Бэрэк зразумеў, што трапіў у пастку. Акружаны з усіх бакоў, ён вырашыў прадаць сваё жыцьцё як мага даражэй...

Ёсьць розныя меркаваньні пра тое, што было далей пасьля пачатку контратакі вугорцаў. Паводле адной вэрсіі, вугорцы, акружыўшы падпалкоўніка, прапанавалі яму сыйсьці з каня і здацца, але ён не пачуў, пасьля чаго атрымаў удар у галаву ад гусара Стэфана Тота (таксама мэдаль "За храбрасьць"), упаў і быў затаптаны канямі. Паводле другой вэрсіі, Бэрэк проста не пажадаў здацца, ну і паводле трэцяй, якая зазначаная ў Польскім слоўніку біяграфічным, ён сам прасіў аб літасьці, але быў засечаны.

Смутак апанаваў легіёны. Бэрэк сапраўды быў сымбалем барацьбы за Бацькаўшчыну і стаў легендаю пасьля сьмерці. Пра Бэрэка ўспаміналі, калі краіна ўздымалася супраць акупантаў у 1831, 1863 гадах. Газэта "Манітор" ад 19 чэрвеня 1809 году пісала: "Бэрэк Ясялевіч — першы габрай Рэчы Паспалітай, які паказаў сваім адзінаверцам шлях гонару і даў прыклад гераічнага служэньня Бацькаўшчыне".

**Андрэй Шпунт**

* Рэгімэнт — полк.

** Швадрон — кавалерыйская адзінка, складалася зь дзьвюх харугваў; 1 харугва — 100 вершнікаў.

*** Камісіянэр — пасярэднік у зьдзелках.

**** Фактарства — блізкае паводле сэнсу да камісіянэрства; спасярэдніцтва паміж сваім патронам ды іншымі асобамі.

М у з э й

# Ручнік і намітка ў прасторы і часе

Зтае пары, калі памяшканьне былой пошты на вуліцы Савецкай, 8 у 1992 годзе было ператворанае ў экспазыцыйную залю Гомельскага абласнога краязнаўчага музэя, тут адкрытая ўжо дванаццатая выстава. Яна прысьвечаная найстаражытнейшаму прадмету беларускай культуры — ручніку.

Што сталася падставаю для выставы? Па-першае, праграма Беларускага Інстытуту праблемаў культуры "Беларускі ручнік", па-другое, значная колькасьць ручнікоў, назапашаных у фондах Гомельскага абласнога і Веткаўскага музэяў, па-трэцяе, вынікі фундамэнтальнай дасьледчай работы супрацоўнікаў Веткаўскага музэя па сэмантыцы арнамэнтаў і характарыстыках ручнікоў Веткаўшчыны і навакольляў.

Дырэктар Веткаўскага музэя народнай творчасьці Галіна Нячаева, якая прысьвяціла гэтай тэме 15 гадоў сваёй працы, і стала аўтарам навуковай канцэпцыі выставы "Ручнік і намітка ў прасторы і часе". У зьбіраньні экспанатаў па вобласьці шмат дапамаглі супрацоўнікі абласнога і раённых цэнтраў народнай творчасьці. Стваралі экспазыцыю Г.Нячаева, Т.Літвінава, А.Дваронін, В.Лямцава пры ўдзеле іншых калег. Праца была цікавая, але і цяжкая. Уявіце сабе груды з амаль што пяці соцень падоўжаных узорыстых тканін. Зь цягам часу кожны ручнік адшукваў сваё месца, а калі займаў яго, пачынаў "размаўляць" з рэчамі, якія абкружаць яго.

Захаваныя ў фондавых шафах, гэтыя ручнікі арганізуюць цэлыя тэматычныя зоны шляху ручніка ад яго паходжаньня да ўдзелу ва ўсім жыцьці беларуса: у будзённасьці і сьвятах, у сельскагаспадарчых і сямейных абрадах, у заклінальнаахоўных маленьнях. Такія дэкаратыўна выкананыя вобразныя зоны паступова ўзьнікаюць адна за адной. Спачатку, натуральна, "Стварэньне сусьвету". Гэта кампазыцыя, дзе з "хлябей нябесных" сыплецца дождж ткацкіх прыладаў. Пасланае зь нябёсаў уменьне і прызначэньне ткаць выконвала жанчына-"радзіцельніца". З марамі і пажаданьнямі дабра сваёй сям'і і блізкім, доўгімі вечарамі ў час посту "нараджала" яна сьвятыя тканіны.

Усё, што зьяўляецца на зямлі, крочыць па жыцьці ў часе, г.зн. рухаецца. Зона "Перавоз" ці "Плаваньне" арганізаваная вялікім чоўнам, які плыве па ручніку-рацэ ці ручніку-шляху. З бортаў зьвісаюць арнамэнтаваныя жыцьцёвымі знакамі ручнікі, сымбалізуючы ўсё тое, што



дапамагае рухацца: вёслы, крылы, ці плаўнікі. Побач, як маленькі карабельчык, — дзіцячая люлька, у якой чалавек пачынае "плысьці" па жыцьці. А завяршае тэму жыцьцёвага шляху — крыж з ручніком. Гэта тая дарога, якая ўжо скіраваная вышэй зямлі, да неба. Накрыты ручнікамі крыж адпраўляў пасланьне зь зямлі ў вышэйшы сьвет. Крыжы-абярэгі ставілі на скрыжаваньні дарог, каб абясшкодзіць зло.

Пакланяючыся нябёсам, людзі ніколі не забывалі тых, хто сыходзіў у зямлю, — сваіх продкаў. У сьвятах памінальня памерлых родзічаў заўсёды ўдзельнікаў ручнік. Асноўныя дні ўспаміну — вясной Радаўніца і Дзяды восеньню. Вобраз радунічных мо-



гілак з адноўленымі на крыжах ручнікамі і зьмітравай памінальнай суботы ўтварае задні плян зоны "Перавоз".

Сымбаль-схема роду чалавечага з каранямі патомствам — дрэва заўсёды шанавалася ў народзе. Яго замольвалі вывешваньнем ручнікоў на галінах, яго выяўлялі ў ручніковай арнамэнтыцы. Цэнтральная сьцяна нашай выставы — гэтая карціна, у цэнтры якой — раскідзістае Дрэва. Ягоныя гальлё і ствол выкананыя з тканых ручнікоў са знакамі Дрэва жыцьця ці Сусьветнага Дрэва.

Каб жыцьцё не прыпынялася, каб была магчымасьць плысьці, патрэбная вада. Зігзагападобныя выявы вады ёсьць на многіх ручніках. Молячы аб вадзе, ручнікамі ўпрыгожвалі сьвятыя крыніцы. Месцам, дзе бездань вады, заўсёды лічыліся крыніцы і калодзежы. Каб быў дождж, да іх прыносілі ахвяры для Маці-Сырой-Зямлі.

*Вось мы ідзем, нясем,*
*Чыстае слова мовім*
*І аб дажджы цябе молім.*
*Зьмілуйся, усплач над намі,*
*Маці з душой-калодзежам —*
*Усякага ты напоіш,*
*Усякага ты абмыеш...*

Г.Нячаева "Маленьне аб дажджы" (паэтычны пераклад з мовы арнамэнту)

Тэматычныя зоны "Маленьне аб вадзе" і "Бераг" пераходзяць у кампазыцыю "Поле". Рамбічныя знакі нівы, у якую кінулі зерне, а пасьля зь іх прараслі новыя каласы з новым зернем — гэта ўсё маленьне: "Пашлі нам, Божа, многа збожжа!" Каб зьдзейсьнілася гэта, ніву-маці трэба разараць, засеяць, даждом паліць, і яна народзіць хлеба, каб было людзям "поўна, сыта!" У плеценыя кубелы засыпаны ўраджай, ручніком абвязаны апошні дажыначны сноп. Гэты сноп у хаце на покуці будзе справаздачай дзядам-дамавікам аб добрым сёлетнім ураджаі і зваротам да Бога аб будучым.

Кампазыцыя "Хата" фрагмэнтарна дае асноўныя традыцыйныя зоны ўнутранага ўбранства жыльля. Тут і тэма ніколі ня згаснага хатняга агмяню — печы з ручнікамі, арнамэнтаванымі вогненнымі знакамі, і "краснага кута", дзе зьмяшчалі абразы, упрыгожаныя ручнікамі-набожнікамі. У гэтай хаце вясельле, на якое тры сыны гаспадароў сасваталі нявестак з розных рэгіёнаў Гомельшчыны. У кожнай свой пасаг зь вялікай колькасьцю нарыхтаваных загадзя ручнікоў. Кожнай зь іх вось-вось абкруцяць вакол галавы доўгі тонкі ручнік-намітку. І кожная зьявіцца сьвету ў новай якасьці — жонкі. Яна пачне новую сям'ю, будзе засьцілаць на стол абрус з двух сшытых паміж сабою ручнікоў — злучэньне двух родаў у адзін. Сям'я будзе расьці, усе будуць зьбірацца за гэтым аб'яднальным сталом. Так было і будзе заўсёды. Нездарма ж на вясельлі маладых зьвязвалі адным ручніком-шляхам. Ніколі не перарвецца Род чалавечы, а ручнік са сваёй таямнічай ахоўнай сілай будзе зьвязваць нас зь Нябёсамі і зь Зямлёй продкаў.

*Спагадны сьвет! Бязьмежны сьвеце!*
*З дажджамі, зоркамі, вятрамі,*
*ня дай задзьмуць*
*жыцьцёвай сьвечкі —*
*ня дай душу зямлі параніць.*
*Пайду па ўсёй зямлі радзімай,..*
*Сусьвету нізка пакланюся*
*і памалюся на дарогу,*
*што ад мінуўшчыны у вечнасьць*
*радзінным ручніком спавіта.*

**Таццяна Літвінава**

ным восеньскім днём, калі пачалася Праверка, кантралёрка ехала ў тралейбусе безь білету. Дакладней, квіточак на праезд ляжаў у ейным вацку, але яна забылася скарыстацца кампостарам.

Жанчына сядзела на адзінарным сядзеньні адразу за сярэднімі дзьвярыма, бліжэй да задняй пляцоўкі. Яна думала пра тое, як прыйдзе на працу, пераапранецца і заступіць на сваю пачэсную вахту. А яшчэ жанчына ўзгадвала дзяцінства, і ў гэтых згадках чамусьці прысутнічаў ЁН, ягоныя вялікія рукі, мужныя вочы й непрыгожы прыцягальны голас, які выклікае салодкую млосьць ва ўсім целе...

Тралейбус рэзка затармазіў і спыніўся пасярод праспэкту. Чыясьці мужная рука проста на хаду адчапіла “рожкі” ад дроту. Людзі пасыпаліся ўперад салёну. Хтосьці застагнаў, пачуўся дзіцячы енк... Кіроўца, перапэцканы крывёю з расьсечанага брыва, схапіўся за манціроўку, каб пакараць невядомага ліхача. Ён расчыніў дзьверы, і адразу абмяк, нібы садзьмуты балёнік. У салён тралейбуса ўвайшоў ЁН.

— Прэзыдэнцкая праверка! Усе застаюцца на месцах. Прад’явіць бялецікі!

— Ваш білецік? Добра. Ваш? Вельмі добра. А ў Вас, жанчына?

— Зараз, зараз, — рукі кантралёркі дрыжэлі, гэтак як вусны, як сэрца, — Вы ведаеце, я кантралёрка, памятаеце, Вы мяне прасілі?.. Я ўсё зрабіла. Там на станцыі... Я ўсё падрыхтавала...

— У Вас што, няма білеціка?! А можа ты ня чула мой учорашні ўказ?!!

— Зараз, зараз, любы мой сябра...

— Гэтую вывесьці, — загад быў кінуты іншым членам Прэзыдэнцкай праверкі. — Далей, Ваш білецік?..

Кантралёрку ахайна ўзялі пад локці, вывелі на тратуар, бліжэй да сьцяны Галоўнай Гарадзкой Крамы, і расстралялі.

*Прагледзелі фартуну, каханьне, ідэю, сустрэчу, сьмерць, волю, слабасьць, вясну, вечар — Жыцьцё — гэта значыць сябе, Чалавека.*

*Ня справіліся, ня здолелі, не спрасьціліся, не напружыліся, не зажыцьцёвіліся — пазбавілі сябе Чалавека.*

*Спрадметніліся. Задаволіліся. Зруйнаваліся. Зьнечалавечыліся... Хачу быць канём — хачу сьцьвердзіцца, памацаць, паіскрыцца, пакрычэць... Хачу быць канём!*

*Каб на звычайныя чалавечыя ўчынкі атрымаць надзвычайную рэакцыю, трэба стаць канём.*

*... Прыхільнікі натхнілі.*

Славамір Мрожак

# Хачу быць канём

Божа ж мой! Як я хачу быць канём! Як толькі б убачыў у люстэрку, што замест ног і рук маю капыты, ззаду хвост і сапраўдную конскую галаву, зараз бы кінуўся ў выканкам.

— Калі ласачка, мне сучасную вялікую кватэру, — сказаў бы я.

— Пакіньце заяву і чакайце сваёй чаргі.

— Га-га-га, — зарагатаў бы я, — ці ж спадарства ня бачыць, што я не звычайны, так сабе шэры чалавечак! Я іншы, экстра.

І адразу б атрымаў сучасную вялікую кватэру з ванным пакоем.

Выступаў бы ў кабарэ, і ніхто б не сказаў, што я няздольны. Нат калі б мае тэксты былі ня вельмі. Наадварот.

— Як для каня, дык нішто сабе, — хвалілі б мяне.

— Ён з галавою, — адзначалі б іншыя.

Не кажу ўжо пра карысьць, якая б выпала мне з прымавак: здаровы, як конь; рагатаць, як конь; у каня чатыры нагі, і той спатыкаецца...



Натуральна, будучы канём, маеш і нэгатыўныя моманты. Сваім ворагам я даў бы зброю. Пісаць ананімкі такога кшталту: “Ці Вы — конь? Ці Вы — поні?”.

Жанчыны б цікавіліся мною:

— Вы такі непаўторны мужчына, — казалі б яны.

Набліжаючыся да неба, гэта факт, я б атрымаў крылы. І тады стаў бы пэгасам. Конь з крыламі! Ці ж можа быць штосьці больш прыемнае для чалавека?

*Прадмова і пераклад з польскай*
**Вольгі Караткевіч**

Адам Глёбус

# Занатоўкі эгаіста



## Месца, дзе час плыве марудна...

На транспартных прыпынках спыняесься ня толькі сам, але й час замаруджваецца, і спрабуеш яго падштурхоўваць позіркам на гадзіньнік.

У замкнёнай невялікай прасторы час паўзе. Ты імкліва ляціш у самалёце, а час пасоўваецца марудна, нібыта ў турэмнай камэры.

Вельмі павольна хвіліны цякуць у чэргах. Наогул, чарга — сымбаль маруднасьці.

Для пацыента ў бальніцы час цяжкі, доўгі і маркотны.

На паседжаньнях, сходах, канфэрэнцыях час крочыць неталопка. У якасьці доказу на сталах і крэслах застаюцца скрэмзаныя шматкі паперы. Бяздумнае крэсьленьне на аркушах імітуе дзейнасьць і запаўняе час.

Назіраньне за стрэлкамі і цыфэрблятам істотна замаруджвае час. Побач з храномэтрамі імгненьні ператвараюцца ў хвіліны. Калі ты чакаў каханую пад гадзіньнікам, дык ведаеш месца, дзе час плыве марудна.

## Месцы, дзе час пралятае імгненна...

У ложку з каханай жанчынаю час пралятае імкліва, як нідзе.

На барцоўскім кіліме, на рынзе, на футбольным полі, на баскетбольнай пляцоўцы час рухаецца хутка, але найхутчэй ён бяжыць на полі бою, у рукапашнай схватцы.

За картачным сталом гадзіны пераўтвараюцца ў хвіліны. Азарт зьядае час, як воўк ягня.

Каля магнітафона, тэлевізара, кампутара час паскараецца. Тэлефон гэтаксама здатны ўсмоктваць хвіліны.

## Месцы, дзе ўзьнікае жаданьне забіць час...

У жытнёвым полі, на санцапёку можа ўзьнікнуць жаданьне спыніць час, не прыпыніць, не замарудзіць і не паскорыць, а забіць.

Вінцэнт Ван Гог і застрэліўся, ахоплены пякельнай прагай забіць час пасярод жытнёвага поля.

У фальклёры ёсьць вобраз пачвары, якая ўзьнікае ў самы санцапёк апоўдні — Кадук. Ён здатны глынаць людзей, жыцьцё і час.

А дванаццатай ночы, на адзіноце, ў пустым памяшканьні само сабою зьяўляецца памкненьне прыпыніць час. Асабліва моцна жаданьне выяўляецца ўзімку, калі ночы бясконца-доўгія. Можа таму так урачыста, ярка, вогненна сьвяткуецца Новы Год.

На золку, пасьля пакутлівага бяссоньня ледзь стрымліваесься, каб ня скончыць з часам раз і назаўсёды.

*16.12.1996*

# Інтэрнэце

тыка?

Біркерц. Гэта хутчэй прафіляктычная мера... Я мяркую, што такія рэчы важна абмяркоўваць.

Пытаньне. Чаму вы лічыце, што кібэпрастора — гэта кепска?

Біркерц. Я не перакананы, што гэта кепска, але думаю, што і ня добра, бо сотні мільёнаў людзей марнуюць незьлічоную колькасьць гадзінаў, утаропіўшыся вось у гэткія маніторы.

Пытаньне. Што вы маеце на ўвазе пад тэрмінам “падлучанасьць”? У “Гутэнбэргавых элегіях” вы пішаце, што людзі, злучаючыся паміж сабою праз Інтэрнэт, патрапляюць у сьмяротную небясьпеку.

Біркерц. Я не кажу пра небясьпеку. Хутчэй трэба казаць пра тое, што замест “рэальнага” жывога сумоўя людзей ўсё болей і болей распаўсюджаным робіцца эрзац і зносіны праз электронны мэдыюм. Я настойваю на тым, што кантакты мусяць адбывацца паміж жывымі асобамі твар у твар.

Пытаньне. У сваёй кнізе вы спасылаецеся на кнігу Уолтэра Бэнджаміна “Твор мастацтва ў эпоху мэханічнага памнажэньня”. Хіба кнігі — вынік мэханічнага памнажэньня? Хіба аўтарская “аўра” ня гэтаксама абмяжоўваецца друкаванай старонкай як і кампутарным маніторам? Хіба сам чалавечы голас, мова як такая, друк і аптычнае валакно не зьяўляюцца проста пасярэднікамі?

Біркерц. Існуе вялікая розьніца, як перадаецца мова. Сродак перадачы ўжо сам па сабе ёсьць часткай зносінаў. Зусім не адно і тое ж словы, высечаныя на камені і выразаныя на дрэве; словы, намаляваныя на небе самалётам, і надрукаваныя на паперы.

Пытаньне. Ці ёсьць канец удумлівага чытаньня вяртаньнем да барбарызму?

Біркерц. Мае апасеньні тычацца таго, што грамадзтва ператворыцца ў дасканала арганізаваны, эгаістычны і бездухоўны мэханізм.

Пытаньне. Ваша тэорыя трохі ўвагнала мяне ў дэпрэсію. Чаму вы лічыце, што чытаньне электронных кнігаў адрозьніваецца ад чытаньня папяровых?

Біркерц. Бо папяровыя кнігі заканчваюцца з апошняй старонкай і вяртаюць вас назад да самога сябе. У той час, як чытаньне электронных тэкстаў адсылае вас у зачараваны сьвет замкнёнага кола гіпэрсувязяў (маюцца на ўвазе ўласьцівыя для Інтэрнэту і ўвогуле для электронных кніг перакрыжаваныя спасылкі, дзе пры згадваньні нейкага тэрміну, падзеі, аўтара і г.д., дастаткова націснуць на яго “мышшу”, каб кампутар перакінуў вас да асобнага тэксту на гэтую тэму, дзе паўтараецца тое ж самае, і так можа доўжыцца да бясконцасьці — У.Б.).

Пытаньне. Як хутка, на ваш погляд, традыцыйныя кнігі пакінуць нашую культуру, будучы выцесьненыя відэакнігамі?

Біркерц. Я ня думаю, што яны цалкам зьнікнуць, але гадоў праз дваццаць кнігі будуць выглядаць як цяпер Джымі Хэндрыкс на старых вінілавых кружэлках.

Пытаньне. Ці не прывядзе разьвіцьцё Інтэрнэту да павелічэньня чытацкага майстэрства і ці не паспрыяе гэта здольнасьці хутка набіраць на кампутары і пісаць без памылак, што зробіць напісанае слова больш выразным і чыстым?

Біркерц. Мая інтуіцыя падказвае, што ў гэтым выпадку будзе больш “КАМПУТАРНАГА НАБОРУ”, чымся пісаньня, і што вынікам такога віду зносінаў будзе пагаршэньне стылістычных і рытмічных якасьцяў нашага сумоўя.

Пытаньне. Свэн, самі думкі ў галаве маюць электрычную прыроду. Дык чаму ім ня стацца элекроннымі па-за нашымі галовамі?

Біркерц. Асабіста я заўсёды лічыў, што думкі ў галаве маюць арганічную прыроду.

Пытаньне. Я неяк чытаў, што тэлевізія мае прыкметы сымптомаў шызафрэніі. Ці зьяўляецца кібэрнэтызаваная сьвядомасьць нагэтулькі ж шызафрэнічнай, як і раздвоеная сьвядомасьць шызафрэніка?

Біркерц. Цалкам згодны. Нават сам характар вось гэтай гутаркі — тыповы прыклад электроннага абмену думкамі — шызафрэнічны. Ну хіба ня так?

Пытаньне. А ці ёсьць якія добрыя бакі кібэрпрасторы?

Біркерц. Я мяркую, што яна можа добра паслужыць для перасылкі, захаваньня і хуткага доступу да базаў зьвестак, але ня трэба блытаць зьвесткі зь іншымі відамі інфармацыі.

Пытаньне. Ці ня лічыце вы, што кібэрпрастора і розныя іншыя “он-лайнавыя штучкі” — гэта вынік натуральнай эвалюцыі камунікацыйнага працэсу? Хіба эвалюцыя кепская рэч? Спачатку мы гутарылі твар у твар, пасьля пачалі пісаць лісты, трохі пазьней сталі карыстацца тэлефонам, а сёньня маем зносіны праз Інтэрнэт.

Біркерц. Я ня думаю, што мы мусім сьлепа ўзаконьваць любыя вялікія зрухі ў нашым калектыўным жыцьці толькі таму, што нехта кажа пра іх непазьбежнасьць ці “эвалюцыйнасьць”.

Вядучы. А можа мудрасьць усё ж неяк захаваецца ў наўпроставым кампутарным этэры?

Біркерц. Не.

Пытаньне. Хіба ня лепей, калі людзі бавяць час у Інтэрнэце, чымся тырчаць перад тэлевізарам, які прамывае ім мазгі?

Біркерц. Абое рабое.

Пытаньне. Асабіста я выкарыстоўваю свой кампутар для сувязі зь іншымі блізкімі мне паводле думак людзьмі. Я жыву за тысячы кілямэтраў ад іх, а дзякуючы Інтэрнэту мы робімся бліжэй адзін да аднаго. Хіба ў гэтым няма карысьці?

Біркерц. Пытаньне толькі ў тым, наколькі бліжэй. У мяне такое пачуцьцё, што цяпер я гавару зь нейкімі фантомамі на няіснай тэрыторыі.

Пытаньне. Гэта так. Але калі б не існаваньне Інтэрнэту НІВОДЗІН з нас НЯ МЕЎ БЫ ніякага шанцу пагаварыць адзін з адным. Як вы можаце казаць, што такое павелічэньне ўзаемадзеяньня і колькасьці кантактаў кепскае???

Біркерц. А чаму мы павінны лічыць такі выбух кантактаў нагэтулькі важным? Я б нават сказаў, што лепей было б, каб у нас было меней кантактаў. Тады было б болей часу зазірнуць у саміх сябе.

Пытаньне. Хіба вы ня згодны, што Інтэрнэт, зьмяняючы парадыгму ліставаньня, стварае больш моцнае пачуцьцё лучнасьці і пакідае мала месца для дыскрымінацыі паводле полу, перакананьняў, расы і г.д.?

Біркерц. Няўжо? Гэта толькі часовая бачнасьць. Лепшымі мы ад гэтага ня робімся. Дыскрымінацыі няма толькі таму, што мы ня бачым таго, хто набірае тэкст.

Пытаньне. Я лічу, што ў сапраўднасьці кампутары прымушаюць нас вярнуцца “да асноваў” чытаньня і пісаньня — занятку, забытага з наступам тэлефонаў. А цяпер нават 5-гадовыя вучні кантактуюць праз набраны пры дапамозе клявіятуры тэкст, а не праз сказанае ў слухаўку слова. Што скажаце наконт гэтага?

Біркерц. Хацелася б верыць.

Пытаньне. Калісьці людзі лічылі, што тэлефон разбурыць грамадзтва, замяніўшы сабою фізычныя зносіны. Але на справе ён даказаў сваю карысьць. Адкуль вы ведаеце, можа і Інтэрнэт дакажа сваю карысьць, асабліва ў адукацыі?

Біркерц. Што я, па-вашаму, вычварэнец, які заклікае пазбавіцца спачатку ад тэлефону, пасьля ад машыны, а затым заняцца прымітыўным земляробствам? Назад шляху няма, і было б дурнотаю гэтага жадаць. Але наперад мы мусім ісьці з усьведамленьнем таго, з чым нам давядзецца разьвітацца раз і назаўсёды.

Вядучы. Апошняе пытаньне. Адзін з вашых любімых аўтараў — Уокер Пэрсі. Калі б ён жыў сёньня і мусіў быў напісаць раман пра Інтэрнэт, што б ён напісаў?

Біркерц. Мяркую, што ў пэўным сэнсе ён яго ўжо напісаў. Гэта — “Згубленыя ў космасе”.

Вядучы. Дзякуй, Свэн. Да пабачэньня.

**Падрыхтаваў Уладзімер Бараніч**

Музыка

# “Блюз жыве ў Менску”

20-21 сьнежня Менск стаў яшчэ і сталіцай міжнароднага блюзавага руху. Да гэткага гучнага параўнаньня падводзіць, папершае, месца правядзеньня фэстывалю — кінатэатар “Масква”, па-другое, імкненьне арганізатараў фэстывалю прадэманстраваць высокі міжнародны ўзровень беларускіх выканаўцаў, пра што вузкае кола прыхільнікаў блюзу ведае, шырокая аўдыторыя здагадваецца, а замежныя госьці нават і ня чулі. Прыкладам таму словы лідара маскоўскага гурту “Лига блюза” Мікалая Аруцюнава, які дагэтуль лічыў, што адзіны варты ўвагі гурт у Беларусі — ”Крама”... Ня тое, што “Крама” — гурт ня варты добрых словаў, але ж джаз і блюз у Беларусі маюць пэўную гісторыю, і пачалася яна задоўга да часоў пераможнага шэсьця “Крамы” па расейскіх прасторах.

Натуральна, прадставіць мінуласьць, цяпершчыну і будучыню беларускага блюзу ва ўсіх ягоных магчымых і немагчымых адгалінаваньнях, у асобах легендарных і маладых выканаўцаў і намагаліся арганізатары фэстывалю: менскі “Star Club” і прадстаўніцтва “Philip Morris” у Беларусі. Дзьмітры Хрол, выступаючы ад імя апошняга, неаднаразова падкрэсьліваў, што такая прадстаўнічая сусьветнавядомая кампанія падтрымлівае праекты, якія ўносяць нешта сапраўды значнае ў разьвіцьцё грамадзтва і краіны, у якой працуе кампанія. Гэткім чынам, арганізатарам вельмі пашчасьціла з фундатарам, знайсьці якога для некамэрцыйнай музыкі — заўсёды пэўны клопат. І што самае прыемнае, канкурэнцыю з сольным канцэртам Філіпа Кіркорава фэстываль “Блюз жыве ў Менску” вытрымаў, чым яшчэ раз апраўдаў свой назоў.



Імпрэза дапраўды прайшла збольшага на міжнародным узроўні, міжнароднасьць забясьпечвалася гасьцямі з краінаў самага блізкага замежжа (Літва, Украіна, Расея) і найблізкага “далёкага замежжа” (малады калектыў з Польшчы “Blues Beer drinkers”, музыкі якога і аказаліся збольшага аматарамі піва).

Першы дзень фэстывалю стаў днём знаёмства з заляй, аўдыторыяй, выканаўцамі, асартымэнтам і цэнамі ў бары і г.д. і ад гэтага днём няпростым для маладых беларускіх калектываў, якія далі зразумець прысутным, што фэстывальны рух у Беларусі будзе жыць і перамагаць, не зважаючы на неспрыяльныя рознага характару ўмовы. Калектыў “Дождж” з Украіны не застаўся па-за ўвагай. Але ж асноўным быў дзень други, і гэта не выклікае зьдзіўленьня, бо ў афішах былі заяўленыя найлепшыя людзі блюзу Беларусі, майстры гітары Іван Маркаў, Аркадзь Юшын, Уладзімір Ткачэнка, Леанід Вярэніч, а таксама маскоўскія госьці — “Лига блюза”.

Прыемна адзначыць той факт, што публіка прыйшла на фэстываль, а не на расейскіх музыкаў, як гэта звычайна здараецца пад час прыездаў тамтэйшых гастралёраў. Блюзавы маратон набіраў хуткасьці, нараджаліся імправізаваныя калектывы: гралі ў дуэце Аркадзь Юшын і Ўладзімір Ткачэнка, гармонік Ігара Варашкевіча ў хвалі шчыльнага гуку мультыінструмэнтальнае “Яблычнае гарбаты” спалучаўся з гітарай Леаніда Вярэніча. Лідар “Лиги блюза” Мікалай Аруцюнаў выдаваў зь сябе поўнае захапленьне. Паводле ягоных словаў, “Лига” — зьява гастрольная і збольшага вандруе па сьвеце, карацей, едуць, куды запросяць, адлегласьць не засмучае, выступленьне ў Менску сталася для іх сапраўдным сьвятам. І што самае галоўнае, сьвятам гэтыя дні сталіся і для музыкаў, якія нарэшце зьведалі заслужаныя аплядысмэнты за выкананьне ўлюбёнай музыкі: хтосьці з гледачоў ізноўку стаў маладым, хтосьці атрымаў доўгачаканы ў Беларусі блюзавы “сатысфэкшн”, хтосьці збольшага пакрыў пралом музычнае неадукаванасьці. Я таксама там прысутнічала, сядзела на лесьвіцы, трымаючы вопратку на каленках (бо на мяне месцаў у гардэробе не хапіла), і радавалася за ўвесь беларускі народ.

**Іра Гінэс**




# Ж.С.У.Н.Б. П.П.Р.Б.

Ня гледзячы на відавочна ўзрослую, як якасна, так і колькасна, любоў нашага народу да ўсялякіх сьвятаў, абумоўленых, мабыць, агромністым уздымам прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і ўсіх астатніх галінаў чалавечай дзейнасьці, некаторых прадстаўнікоў беларускага мастацтва па-ранейшаму мучае пэсымізм. І неўзабаве пасьля прэзэнтацыі новай калекцыі рытуальнае мэблі Артура Клінава настрой гэтай акцыі праявіўся і на "рокфронце".

Куміры адносна прагрэсіўнай часткі беларускае моладзі — музыкі "Нэйра Дзюбэля" — запатэнтавалі ўласны спосаб пазбаўленьня жыцьця, напоўніцу альтэрнатыўны такому прымітыўнаму і папулярнаму сярод масаў віду самагубства, як павешаньне. У менскім Палацы шашак і шахмат адбылася прэзэнтацыя новага "дзюбялёўскага" альбому "Жорсткае самагубства ўнівэрсальнай нарэзкай Бэрнэра".

Да беспасярэдняй рэалізацыі ідэяў "НД" пад час імпрэзы, дзякаваць Богу, не дайшло. Магчыма, з тае прычыны, што мала хто з прысутных ведаў, што такое "ўнівэрсальная нарэзка Бэрнэра" і дзе яе шукаць. Канцэрт увогуле прайшоў на дзіва спакойна, без уласьцівага шмат якім падобным падзеям апошняга часу ажыятажу. Публіка, сярод якой пераважалі прыхільнікі каманды тынэйджарскага ўзросту, ціхмяна тусавалася, піла піва і ня надта ціхмяна, але й не зусім бурліва адцягвалася й танчыла. Цікава, што паверхам ніжэй сабраліся мясцовыя аматары шашак і шахмат, але канцэрт і ўсё, што зь яго выцякала, не перашкодзіў іхняй гульні. Чамусьці амаль не было і мэтраў музычных дый калямузычных тусовак, якія апошнім часам справядліва зацікавіліся "Нэйра Дзюбэлем". Зрэшты, апошняе цалкам зразумела: прэзэнтацыя прайшла занадта цьвяроза, як для такіх падзеяў. Карацей, чаканага чаду не было, але ж ня ў ім, пэўне, шчасьце. Адзінае, што прыкмецілася на імпрэзе апроч самога канцэрту — зьяўленьне рэдактара экстрэмальнага часопіса "Яма" Мітрыча, які вырашыў наведаць канцэрт у кампаніі з уласным сабакам, але з гэтае, пэўна, прычыны і "абламіўся".

Сам канцэрт пачаўся з выкананьня ўсіх 14 песень новага альбому, а скончыўся татальным агучваньнем "усенароднalюбімых" хітоў трох-чатырохгадовай даўнасьці. Само выкананьне песень, як заўжды, суправаджалася добрым шоў. На сцэне раз-пораз зьяўляліся пэрсанажы тых ці іншых кампазыцыяў: Юры Гагарын, якому музыкі прылюдна прызнаваліся ў любові і каханьні, Аляксандар Саладуха, які выканаў куплет "Чужой милой" (гэты рымэйк "дзюбялі" зрабілі ў агрэсіўнай хардкоравай манеры). Толькі вось чамусьці пад час выкананьня песьні "П.П.Р.Б." ніхто не зьявіўся.

Новы альбом "Нэйра Дзюбэля" можна бясспрэчна назваць больш сталым за іхнія мінулыя опусы. І сталасьць гэтая праяўляецца найбольш у музыцы. Калі раней гэтаму несумнеўна важнаму кампанэнту асаблівай увагі не аддавалася, дык цяпер сытуацыя зьмянілася ў лепшы бок. Зьявіліся цікавыя спэцэфэкты, напрыклад, булькат вады ва ўнітазе. Усё гэта, вядома, не назавеш новым, але з традыцыямі "бруднага расейскага панку" хлопцы, мяркуючы з усяго, урэшце парвалі. Таму цяпер іхнюю музыку цікава слухаць ня толькі прыхільнікам вышэйзгаданай эстэтыкі, але і тым, каму яна выразна не па душы, у ліку якіх і я.

Тэматычна большасьць кампазыцыяў "Ж.С.У.Н.Б." можна ахарактарызаваць як змрочны і даволі інтэлектуальны сацарт, які найбольш яскрава праявіўся ў згаданым вышэй "Гагарыне" дый пад час заклікаў любіць Аклахому ў аднайменнай песеньцы. Асабліва непакояць хлопцаў рэаліі сацмастацтва дня сёньняшняга, прычым самых розных скіраванасьцяў. Хардкоравая "Милая", "Беларусь юбэр алес", "П.П.Р.Б."... Знаёмае гэта нам усё, пагадзіцеся. Прысутнічаюць і іншыя, больш глыбокія матывы, таксама блізкія сучаснаму мастацтву. Яны, натуральна, не дэкляруюцца, і ня варта ламаць галаву, што значыць выраз "Ехали уроды на поминки" ў кантэксьце сёньняшняй палітычнай сытуацыі.

І што самае цікавае, даволі сур'ёзныя і змрочныя песьні "Дзюбэля" выклікаюць чамусьці зусім іншую рэакцыю, асабліва ў публікі на канцэртах, у якой ёсьць рэдкая цяпер магчымасьць адцягнуцца як мае быць. Творчасьць "дзюбялёў" добра ўспрымаецца, магчыма, таксама й таму, што ў ёй прысутнічае незьлічоная колькасьць алюзіяў на ўсім яшчэ зь дзяцінства вядомыя шэдэўры айчыннай папсы і "песьні для савецкіх дзяцей". Усё гэта, у прынцыпе, вельмі ўласьціва для постмадэрнізму, асабліва нашага, пабудаванага шмат у чым на перайначаньні былых рэаліяў, якія сёньня цалкам зьмянілі для нас сваё значэньне.

Увогуле, ня гледзячы на тое, што "Нэйра Дзюбэль" сьпявае ў асноўным па-расейску, ён ужо пасьпеў стаць адметнай падзеяй у нашай рок-музыцы і наагул у сучасным мастацтве. Можна спадзявацца і на тое, што неўзабаве прызнаньне здарыцца ня толькі ў Беларусі. Аднак ёсьць тут, натуральна, такія-сякія пытаньні. Хацеў бы я паглядзець на таго ангельца, які б зь цікаўнасьцю слухаў пра забойства манціроўкай ці П.П.Р.Б...

**Гальляш Сьвірын**

Конкурс

# Краіна замкаў

Гэта апошняе пытаньне нашага конкурсу. Адказаць на яго, як і на папярэднія, Вы зможаце ў наступным годзе. Такім чынам, часу на ўважлівае прачытаньне і на пошукі адказаў хопіць усім.

Замкі Вялікіх князёў, як спосаб абароны, вельмі хутка страцілі сваё прызначэньне. Ужо на пачатку XVI ст. артылерыя і магутная агняпальная зброя зрабілі сярэднявечныя муры небясьпечнымі для тых, хто ймкнуўся за імі схавацца. Дзеля гэтага каменныя муры былі замененыя на земляныя валы, укапаныя бастыёны і равы. Старажытныя замкі сталі пакрысе ператварацца ў помнікі...

Аднак іхнія рамантычныя ўломкі казыталі мроі, будзілі народную памяць, натхнялі клясыкаў на стварэньне неўміручых твораў. У XIX ст. замкі зажылі іншым жыцьцём і трывала ўвайшлі ў нашую нацыянальную культуру...

Які замак Вы бачыце на здымку? На сутоцы якіх рэк ён стаіць? Хто быў ягоным заснавальнікам?

Зычу посьпехаў! Да сустрэчы ў Новым годзе.

**Сяргей Харэўскі**




# Эстэтыка Панку

*Шклоўскі Акадэмічны Панк. Любімыя песьні Сашы Лукашэнкі альбо КАрАвокі па-беларуску, "Luka records inc." & СП "I.Lukjanov production", 1996.*

У рэдакцыю прынесьлі касэту. Што адразу кінулася ў вушы пасьля праслухоўваньня — высокі прафэсіяналізм музыкаў. Па шчырасьці, спачатку зрабілася крыху шкада выканаўцаў. Падалося, што людзі з такімі музычнымі дадзенымі маглі б знайсьці сабе лепшае прымяненьне, чым выконваньне нецэнзурных прыпевак, прысьвечаных першаму прэзыдэнту РБ. Але, праз пэўны час я пераканаўся, што гэтае першае ўражаньне было памылковым. На дзясятай прыпеўцы я пачаў крыху пасьмейвацца, а на дваццатай я рагатаў ва ўвесь голас. Гэта быў такі аздараўляльны сьмех, якога ў мяне не было гады два. Вось, уласна кажучы, і ўсё, што вы можаце чакаць ад гэтай касэты. Пры ўмове, што вы здатныя ўспрымаць нецэнзурныя словы ў кантэксьце, як мастацкі сродак і стыль. Гурт “Шклоўскі Акадэмічны Панк” — першы, хто скарыстаў галоўны козыр А.Лукашэнкі, то бок, зьвярнуўся да масаў у зразумелай для іх форме. Праўда, у адрозьненьне ад А.Лукашэнкі, “ШАП” зрабіў гэта эстэтычна.

**Севярын Квяткоўскі**

## Паштовая скрынка

Вялікі дзякуй усім чытачам, якія павіншавалі нашу рэдакцыю з Калядамі і Новым годам. Нашым сталым чытачам і карэспандэнтам Клаўдзіі Анісавай і Міхасю Маліноўскаму, Першаерарху Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы Ізяславу, дыпляматычным прадстаўніцтвам розных краінаў у Беларусі і проста ўсім, усім чытачам, якія даслалі нам свае віншаваньні, — дзякуй.

**Генадзю Шэпелеву з Барані.** У мінулым нумары мы надрукавалі Ваш допіс пра беларускую школку. Знайшліся людзі, якія хацелі б дапамагчы, але, на жаль, ня маем Вашага дакладнага адрасу. Паведамце, калі ласка.

*Дарэчы, зьвяртаемся да ўсіх нашых чытачоў. Пішыце нам пра школы, якія ацалелі пад наступам русыфікацыі і сёньня яшчэ трымаюцца. Будзем самі шукаць сродкі — і маральныя, і матэрыяльныя.*

**Лелі зь Менску.** Сяброў замнога не бывае. Праблема ў тым, што нават калі мы надрукуем Вашую абвестку сёньня, то да Новага году ўжо ніхто не пасьпее адказаць Вам на гэты адрас. Таму паведамце, калі ласка, які-небудзь іншы свой адрас.

**Усіх — з Новым годам!**

Наступны нумар “Нашай Нівы” выйдзе 13 студзеня.

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19.55, 29/12/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №8119 Кошт свабодны.